УДК 398 (4Беи)

***І.А. Швед***

# СІМВОЛІКА КРЫНІЦЫ Ў БЕЛАРУСКІМ ПЕСЕННЫМ ФАЛЬКЛОРЫ

На беларускім песенным фальклорным матэрыяле прасочана функцыянальнасць вобраза крыніцы як элемента ландшафтна-прыроднага кода. У выніку гісторыка-генетычнага і функцыянальна-семантычнага аналізу раскрыта вітальная, эротыка-фертыльная, магічна-памнажальная семантыка крынічнай вады як універсальнага знака жыцця. Вобраз крыніцы выступае чыннікам семантычнага поля песень пераважна са шлюбна-эратычнымі матывамі. Функцыянаванне вобраза крыніцы як абагульненага знака суму абумоўлена яе асацыяцыяй з цякучымі слязамі і шырэй – міфалагічнай карэляцыяй вады з матывамі небяспекі і смерці.

## Уводзіны

Праблемы глыбокага разумення адметнасцей міфалагічнага мыслення, глыбінных сэнсаў і міфапаэтычных уяўленняў, спецыфікі культурнай трактоўкі сімвалаў, устанаўлення ролі сімвалічнага свету ў функцыянаванні традыцыйнай культуры пэўнага народа маюць прынцыпова фундаментальны характар.

Адным са значных фальклорна-міфалагічных аб’ектаў беларускай традыцыі з’яўляецца крыніца. Фальклорны вобраз крыніцы трапляў у поле зацікаўленняў шэрагу даследчыкаў, якія выказвалі розныя меркаванні наконт генезісу (паходжання, станаўлення і развіцця) і семантыкі названага феномена. Культавым крыніцам прысвечана кніга Э. Зайкоўскага і Л. Дучыц «Жыватворныя крыніцы Беларусі». У ёй змешчаны некаторыя фальклорныя і літаратурныя творы, у якіх прадстаўлены вобраз крыніцы. Крыніцы разглядаюцца ў аднайменным энцыклапедычным артыкуле Э. Зайкоўскага як «прыродныя падземныя воды, якія выходзяць на паверхню зямлі» і ўшаноўваюцца беларусамі з глыбокай старажытнасці. Адносна вобраза крыніцы ў фальклорнай песеннай творчасці аўтар згадаў толькі тое, што «ў сучасным беларускім фальклоры таксама сустракаецца матыў пэўнай сувязі крыніцы са шлюбам» і што ў «некаторых песенных творах з крыніцай параўноўваецца дзяўчына» [1, с. 730–731]. «Філалагічны» бок сімволікі крыніцы ў сувязі з вывучэннем беларускай лірыкі і яе паэтыкі закранаўся Н. Гілевічам у даследаванні «Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Слова і вобраз», А. Гурскім у манаграфіі «Пазаабрадавая лірыка ўсходніх славян» і некаторымі іншымі даследчыкамі. Разам з тым сімволіка крыніцы ў песенных жанрах беларускага фальклору не была прадметам спецыяльнага даследавання вучоных.

Глыбінны сэнс і багатая полісемія вобраза крыніцы ў беларускай вуснай народнай творчасці яшчэ не дастаткова раскрыты. Мэта дадзенай працы – прасачыць прысутнасць вобраза крыніцы ў песенным фальклоры беларусаў, вызначыць семантыку і сімволіку гэтага вобраза ў абрадавых і пазаабрадавых песнях. Для дасягнення пастаўленай мэты гісторыка-генетычнае вывучэнне, якое арыентуецца на дыяхранічны і парадыгматычны разгляд фальклорнага вобраза крыніцы як цэласнага феномена, дапаўняецца функцыянальна-семантычным даследаваннем.

***

У фальклорным свеце ідэальнай нормы іманентнай, пастаяннай і нязменнай прыкметай крыніцы з’яўляецца халодная (сцюдзёная), празрыстая, чыстая і хутка цякучая вада. (Адзначым, што кожная з гэтых прыкмет развівае цэлую метафарычную вобласць значэнняў у розных відах традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў).

Менавіта такая вада характарызуецца ў народнай тэрміналогіі як «жывая», «здаровая» і проціпастаўляецца стаячай, «мутнай» вадзе (хоць крыніца, паводле песень пра каханне, можа замуціцца). Актуалізацыя вызначаных характарыстык, якія ўказваюць на ідэальную адпаведнасць крыніцы сваёй прыродзе, матывуе сімвалічную суаднесенасць гэтага воднага аб'екта з ідэямі развіцця, плоднасці, вытворчай патэнцыі, актыўнасці, здароўя, хуткага росту, чысціні, поспеху. Адпаведна ў пераважнай большасці беларускіх народных песень крыніца набывае станоўчую ацэнку.

У абрадавых песнях крыніца (часта разам з каменем і дрэвам) утварае пазітыўна асэнсаваны сакральны локус. Крыніца ў такіх кантэкстах выступае сімвалам гарызанталі, надзяляецца ачышчальнай семантыкай і абазначае змену існуючага парадку рэчаў (эфект, які звязваецца з выкананнем песні і абраду). Паводле калядак, у такім месцы Маці Божая нараджае Ісуса Хрыста і мые яго ў сцюдзёнай крыніцы. У веснавых песнях цячэнне крынічнай вады і рост травы асацыююцца з пачаткам новага гаспадарчага года. Гэтая ж ідэя перадаецца праз карціну бушавання вала і выхаду яго ў поле, дзе ёсць «травіца шаўковая» і «вадзіца крынічная» [2, с. 78]. У такіх кантэкстах эпітэт вады «крынічная» выконвае хутчэй не апісальную, а ацэначную функцыю, мае выразную пазітыўную аксіялагізацыю. Тое ж характэрна для функцыянавання аналізуемага вобраза ў вясельных песнях. Да прыкладу, у нявесты просяць: *«Маладая дзевачка, // Паднясі вадзіцы, // Вадзіцы крынічныя. // Вадзіцы крынічныя, // Платочак шаўковы, // Хустачку беленькую»* [3, кн. 1, с. 83]. У сувязі з гэтым згадаем вядомы ўсім славянам абрад ваджэння да крыніцы маладой пасля першай шлюбнай ночы.

Цікава таксама адзначыць, што паводле русальных песень, крынічная вада – сродак, які прычашчае душу і вяртае да жыцця русалак: *«На граной нядзелі // Русалкі сядзелі, // Рана-ранюсенька, // Русалкі сядзелі. // Русалкі сядзелі, // На дзевак глядзелі, // Ой, рана-рана, // На дзевак глядзелі. // – Дзевачкі-сястрыцы, // Падайце вадзіцы, // Ой, рана-рана, // Падайце вадзіцы // З халоднай крыніцы, // Ой, рана-рана, // З халоднай крыніцы. // З халоднай крыніцы // Ды з-пад той вярбіцы, // Ой, рана-рана, // Ды з-пад той вярбіцы. // Падайце вадзіцы // Душу прычасціці, // Ой, рана-рана, // Душу прычасціці…»* [2, с. 78]. Звязаная з падземнымі водамі, надзеленая трансфернымі ўласцівасцямі, крынічная вада станоўча ўплывае на душы людзей, якія перайшлі рубікон свайго зямнога жыцця, і яднае два светы. У адлюстраванні сувязей паміж прадстаўнікамі гэтых светаў дамінуе ўзаемная павага і шанаванне; просьба русалак, звернутая да дзяўчат, гучыць у атмасферы сакральнай інтымнасці. І крынічная вада становіцца магутным чарадзейным сродкам, пры дапамозе якога памерлыя пераходзяць праз мяжу небыцця і быцця, перажываюць змены тыпу «нежывы – жывы»: *«Душа прычасціцца – // Жыццё вараціцца, // Ой, рана-рана, // Жыццё вараціцца. // Тады будзем з вамі // Краскі сабіраці…»* [2, с. 78].

У сувязі са сказаным характэрна, што крыніца ў беларускіх народных уяўленнях асацыявалася з выраем, куды выпраўляюцца на зімоўку многія прадстаўнікі жывёльнага свету. Да прыкладу, лічылася, што некаторыя птушкі, счапіўшыся лапкамі адна з адной і ўтварыўшы адмысловы ланцужок, зімуюць на дне крыніц. Гэтыя вераванні паэтычна прадстаўлены ў купальскіх песнях тыпу *«Лугавая перапёлка, // Дзе ты зіму зімавала, // Дзе ты лета летавала? // – Зімавала у крыніцы, // Летавала у пшаніцы. // – Лугавая перапёлка, // Дзе табе лепш было? // – Было добра у крыніцы, // Яшчэ лепей у пшаніцы»* [4, с. 127].

У вясельных, сацыяльна-побытавых, восеньскіх і іншых песнях крыніца і сад (ці бор) увасабляюць любыя сэрцу нявесты родныя мясціны, вольнае, бесклапотнае жыццё ў бацькоўскай хаце: *«– Не кукуй, мая зязюлька, не кукуй, мая серая, // Да не будзе так, як ў лецечку было: // Да штодзень пры крыніцы, пры студзёнай вадзіцы… // – Не плач,*

*мая Марылька, не плач, маладая, // Да не будзе так, як у матулькі было: // Да штодзень у вяночку, ў дзявоцкім станочку…»* [3, кн. 5, с. 88]. У такіх тэкстах вобраз дзяўчыны, якая збіраецца замуж, звычайна мадэлюецца ў арніталагічным кодзе: *«Баравая цяцера, // Чаго ты з бору ляцела, // Ці табе ў бары надаела? // У бары ягадкі салодкі, // У бары крыніца-вадзіца, // У бары ягадкі сытныя, // У бары вадзіца пітная! // Маладая дзевачка, // Чаго ты замуж хацела, // Ці табе ў маткі надаела? // У маткі падвор'е вузенька, // У маткі гулянне блізенька!..»* [3, с. 198]. У вясельных песнях, дзе мастацкімі сродкамі выразнасці выяўляецца любоў нявесты да роднай старонкі, да сваіх блізкіх, яе вялікі смутак па іх, крынічная вада выступае знакам шчаслівага жыцця ў роднай хаце, з матуляй. Нявеста зайздросціць свайму любаму: *«– Добра табе, мой галубок, а мне не. // У цябе вада ўсё крынічная, а ў мяне не. // Добра табе, мой ты Колечка, а мне не. // У цябе мамка, у цябе родная, а ў мяне не…»* [3, кн. 5, с. 28]. У вясельных песнях праз вобразы крыніцы, зялёнага явара і ядранай пшаніцы – каштоўнасна-значных элементаў касмалагічнай прасторы – распрацоўваецца тэма ідэальнага парадку, касмалагізаванасці і дабрабыту, выяўляецца ідэальная гаспадарка, у прыватнасці свёкра: *«Есць у майго сцяткі зялёны явар на дварэ, // Есць у майго сцяткі ядрона пшаніца ў гародзе, // Есць у майго сцяткі сцюдзёна крыніца ў вароцях»*. З гэтай крыніцы жаніх поіць сваіх сваццяў [3, кн. 1, с. 116].

У песнях на любоўна-шлюбную, сямейную тэматыку вобраз крыніцы звычайна ўзнікае ў сувязі з жаночымі персанажамі, да прыкладу: *«Ой, у полі тры крынічанькі, // Там стаялі тры дзяўчынанькі: // Чарнявая і бялявая, // А трэцяя прыбагатая…»* [5, с. 160]. Выкарыстанне вобраза крыніцы, як і шэрагу іншых элементаў ландшафтна-прыроднага кода, для мастацкай эстэтызацыі звычайных персанажаў – дзяўчат, жанчын – выконвае ў першую чаргу экспрэсіўную функцыю, вытлумачвае з'явы жаночага жыцця праз зварот да больш уражлівых прыродных з'яў.

Паводле песенных тэкстаў, рух персанажа да крыніцы не мае самастойнага значэння, ён матывуецца якой-небудзь канкрэтнай мэтай, да прыкладу, персанаж выпраўляецца да крыніцы набіраць вады, умывацца, купацца і інш. Хаджэнне па ваду да крыніцы выяўляецца ў песнях як абавязак дзяўчыны. Нявеста, ад'язджаючы ў хату жаніха, гаворыць маці: *«А як будзеш кубачак браць, // Будзеш мяне ўспамінаць: // – Няма майго дзіцяці, няма каго пасылаці, // А ні ў лес па ягадкі, ні з крыніцы вадзіцы»* [3, кн. 5, с. 196]. Славесная палітра ў такіх тэкстах насычана асабліва цёплымі колерамі. І калі, жывучы ў бацькоў, дзяўчына ходзіць па крынічную ваду з задавальненнем, то ў хаце свёкра гэтая праца не прыносіць ніякай радасці. Ды і сам вобраз крыніцы ў песнях пра цяжкі лёс замужніцы – прыслугі для ўсіх і кожнага ў мужавай сям'і – губляе сваю пазітыўную ацэнку. Замест вячэры жанчына павінна за ўсіх нядобразычлівых сямейнікаў нанасіць вады з бяздоннай крыніцы: *«Вячэрай, Галю, тую вячэру, // Што мамка наварыла, // Бо пойдзеш к чужой матухне, // Не будзеш вячэраці. // Самі пасядуць, вячэраць будуць. // А цябе па ваду пашлюць, // Па халодную, у крыніцу бяздонную. // Прынясі, Галю, вады, // Прынясі за старога, // Прынясі за маладога…»* [3, кн. 5, с. 250]. І наадварот, аптымістычнае светаўспрыманне, прадчуванне сямейнага шчасця маладых, іх узаемныя пачуцці любові і надзеі раскрываюцца праз карціну іх сумеснага хаджэння па крынічную ваду. Жаніх абяцае: *«– Я ж цябе, маладую, сам пашкадую. // Пойдзем па ваду ды абое разам. // Прынясём вадзіцы ды маёй матаньцы, // Да з новае крыніцы»* [3, кн. 5, с. 269]. Выява сумеснага хаджэння па крынічную ваду можа выступаць спосабам сімвалізацыі здзейсненага факта эмацыйна-сексуальнага яднання маладых і пацвярджэння шлюбнага статусу новаўтворанай пары. Адсюль песенны акцэнт на тым, што крыніца новая.

Крынічная вада ў вясельных магічных актах, скіраваных на дасягненне шчасця і дабрабыту шлюбнай пары, функцыянуе як універсальны сімвал жыцця з цэлым веерам

пазітыўных канатацый – надзяленнем здароўем, сексуальна-пракрэатыўнай актыўнасцю, плоднасцю, багаццем, ладам у сямейным жыцці. Гэтую ж сімволіку выяўляе вобраз крыніцы ў вясельных песнях. Крыніца – гэта і сімвал самой нявесты, яе цноты, маладосці, прыгажосці, весялосці: «*Ой, крыніца, крыніца, // Да ты халодная вадзіца. // Дажджы ідуць, ветры веюць – // Чаму цябе ды не нагрэюць? // – Ой, маладая дзевачка, // Ды ты сядзіш не жалосная. // Дзеўкі пяюць, музыкі граюць – // Чаму цябе ды не разжалюць?*» [3, кн. 5, с. 75]. Вялікую каштоўнасць крынічнай вады сцвярджаюць каравайныя песні. Паводле гэтых песень, сакральнае «замешванне» новай сям'і (= каравая) адбываецца на аснове крынічнай вады, якой прыпісана магічна-памнажальная семантыка: «*Лыймо воду крынычну, сыплю муку пшынычну, // Коровая росчыняймо, молодым долі пожылаймо! // – Ходы, маты, до хаты, будым коровая сожаты, // Быры коцюбу і помыло, коб у пічы чысто було. // – Росты, короваю, вышэй того гаю! // У нашыі Ганночкы молодая маты, // Як завынэцца коровай спычі. // – Ой, лысу, наш лысу, // Налывай воды ў мыску, // Коб ручынькы помыты, // Ды под вышыньку вылыты*» (ФЭАБ; зап. ад Галаўчук Надзеі Аляксандраўны 1938 г.н., з в. Снітава Іванаўскага р-на). Эратычна-сексуальная знакавасць элементаў, з якіх вырабляўся каравай, мела пэўны практычны і магічны сэнс: маладым павінна перадацца тая магутная, жыццядайная сіла Эраса, моц пачуццяў, якія цалкам упісваюцца ў рытм прыроды і могуць быць сімвалічна суаднесены з няспынным рухам «вечна жывой» крынічнай вады. Нездарма сімвалічная карціна напаўнення крыніцы вадой асацыюецца з пачаткам новага жыцця маладой сям'і: «*Царіца Манічка, царіца, // У яе саду пшаніца, // У вароціках крыніца. // Наехаў Ванічка сам дзівят, // Напускаў конікаў цэлы сад. // Яраву пшаніцу вытравіў, // Крыніцу вады выпіў. // Зажурілася Манічка. // – Не гаруй, не тужы, Манічка, // Ярова пшаніца вырасцець, // Крыніца вады набяжыць, // Нам з табой, Манічка, нада жыць*» [6, с. 231].

Згодна з песнямі, крынічная вада неабходная для змывання цеста з рук каравайніц. Такую ваду для рытуальных мэтаў павінны прынесці маладыя хлопцы: «*Хлопчыкы-молодчыкы, // Ідіты до крыныці, // Прынэсітэ й водыці // Корованэчкам рукы міты, // Помывшы рукэ, воду нэсты*» [7, с. 298]. Паводле песень, якія гучалі пры выпраўленні маладога да маладой, жаніх павінен умыцца ў крыніцы: «*Устань, жанішок, ачніся // Да ідзі да крыніцы – умыйся, // Дам табе ручнічок – утрыся, // Віннае яблычка – ахмяліся*» [3, кн. 1, с. 452]. Згодна з іншай вясельнай песняй, жыццядайная крынічная вада патрабуецца, каб акрапіць шлюбны вянок маладой жонкі. Разам з тым намочванне вянка ў крынічнай вадзе карэлюе з прывыканнем маладой замужніцы да цяжкага сямейнага жыцця ў хаце мужа: «*…Просіцца Манечка дадому: // – Завязі, Ванечка, дзе ты ўзяў, // Каб мой тут вяночак да не звяў. // – Не бойся, Манечка, не звяне – // Ёсць у мяне матуля, пагляне. // Прынясе вадзіцы з крыніцы, // Намочыць вяночка ў вадзіцы: // – Намакай, вяночку, намакай, // Прывыкай, Манечка, прывыкай. // Намакай, вяночку, у вадзе – // Прывыкай, Манечка, ка ўсёй бядзе*» [8, с. 193].

Часта крыніца згадваецца ў пазаабрадавых песнях пра каханне, дзе яна мае глыбінна-эратычныя інтэнцыі і абазначае жаночы пачатак у адрозненне ад дрэва (явара, дуба), якое асацыюецца з мужчынскім пачаткам: «*…За туманам нічога не відна, // Толькі відна дуба зелянога. // Пад тым дубам крыніца стаяла, // Там дзяўчына воду набірала. // Ды ўтапіла залато вядзерца, // Засмуціла казакова сэрца. // А хто ж тое вядзерца дастане, // Той са мною на ручніку стане. // Хлопец тое вядзерца дастане, // Ён з табою на ручніку стане*» [5, с. 80–81]. Крыніца фігуруе ў матывах эмацыйна-сексуальнага яднання хлопца і дзяўчыны: «*Ой, у полі тры дубы, // Ой, у полі тры дубы, тры дубы // Схіліліся да купы. // Там у полі крыніца, // Там у полі крыніца, крыніца, // У ёй студзёна вадзіца. // Там малойчык ваду браў, // Там малойчык ваду браў, ваду браў – // Красну дзеўку спадабаў…*» [8, с. 51]. У шматлікіх песнях крыніца сімвалічна

абазначае шчасце, адданае каханне, жыццяздольнасць. Яна маркіруе месца радаснага спаткання хлопца з дзяўчынай: *«Ў чыстым полі крынічэнька. // Там халодна вадзічэнька, о-ха-ха! // Там Раманка каня пасе, // Кацярына воду нясе, о-ха-ха! // Стаў Раманка жартаваці – // Каці воду выліваці, о-ха-ха!...»*. Каб маці не сварылася на дачку за затрымку на крыніцы, дзяўчына выдумляе: *«– Наляцелі гусі з броду – // Памяшалі з пяском воду, о-ха-ха! // А я, млода, усё стаяла, // Пакуль вода чыста стала, о-ха-ха!»* [8, с. 230].

Песням пра каханне характэрны наступны сюжэт: дзяўчына ідзе да чыстай зімовай крыніцы па ваду, хлопец пераймае яе на кані і просіць напаіць каня (на сімвалічным узроўні значыць прыняць яго каханне і адказаць узаемнасцю; страціць цнатлівасць): *«– Дзеванька мая, // Напой мне каня, // Напой з чыстай зімняй крынічэнькі // З поўнага вядра…»* [5, с. 65]. Дзяўчына абяцае выканаць просьбу пасля шлюбнай цырымоніі; закаханы хлопец вядзе яе да свайго двара. І наадварот, адмова піць ваду абазначае адмову кахаць, уступаць у шлюб [9, с. 92]. У вясельных песнях спяваецца пра тое, што крынічнай вадой пояць каня, на якім прыехаў жаніх па нявесту: *«Пушов Іванко до стойніку // Коныка выводыты. // Его конечок сывы, вороны // Нэ хочэ выходыты. // – Ой, ты коню мій, сывы, вороны, // Одчыны бо мні волю. // Як заідэш ты до тэстя во двір, // Той заржэ пудо мною. // Копытамы бый, вушкамы стрыж, // Укынься в сваволю, // Той тобі дадуть, мій сывы коню, // Білуго овса істэ. // А мэні скажуть, мулудэйкому, // В тэстя за столом сістэ, // Той тобі дадуть, мій сывы коню, // Крынічнэі вудэ пыты, // А мэні скажуть, мулудэйкому, // З тэстэйком гувурытэ»* (ФЭАБ; зап. ад Каока Алены Максімаўны, 1938 г.н., з в. Дзівін Кобрынскага р-на). У песнях, дзе вобраз жаніха мадэлюецца ў арнітаморфным кодзе, спяваецца, што жаніха-салаўя пташачкі-дзевачкі *«крынічнай вадой напояць»* [3, кн. 1, с. 352]. У шматлікіх вясельных песнях у нявесты просяць, каб яна паднесла крынічнай вады жаніху, свайму бацьку ці іншым удзельнікам абраду. Але з-за слёз яна не можа знайсці сцежкі да крыніцы [3, кн. 1, с. 116].

У песнях са шлюбнымі матывамі сімвалічная карціна капання крыніцы, выпівання крынічнай вады і знішчэнне конямі пшаніцы ў садзе надзяляецца эратычнымі канатацыямі, з'яўляецца знакам змены статуса маладых у выніку правядзення вясельнай цырымоніі. Капаць крыніцу – значыць кахаць, сватаць дзяўчыну: *«Дазволь, мая маці, крыніцу капаці: // Ці прыйдзе мая дзеўка ваду набіраці…»* [8, с. 240]; *«Капаў, капаў крынічэньку ў сваім саду: // Можа, зайдзе мая міла сюды па ваду. // Капаў, капаў крынічэньку нядзельку ці дзве, // Высватаў я дзяўчынаньку людзям, не сабе. // А ўжо з тае крынічэнькі людзі воду п'юць, // А ўжо ж маю дзяўчынаньку пад вянец вядуць…»* [8, с. 102]. У такіх кантэкстах каханне (складнікам якога была і цялесная ўцеха) выяўляецца як адмысловая праца, якая патрабуе часу і пэўных намаганняў, напружання сіл: *«Не выкапаўшы ў полі крынічанькі, то й не меці вады. // Не выкахаўшы змалу дзяўчыноньку, то й не меці жонкі…»* [8, с. 166]. Недакапаная да дна крыніца выступае вобразна-псіхалагічнай паралеллю дзяўчыны, каханню якой не суджана спраўдзіцца: *«Капаў казак крынічаньку, не дакапаўся да дна, // Жыла ў бацька адна дочка, не нажылася дабра…»* [8, с. 22]. Заляцанне хлопца да дзяўчыны сімвалізуецца яго купаннем у крыніцы. У зараслай жа крыніцы немагчыма купацца, што абазначае немагчымасць заляцацца да дзяўчыны, браць з ёю шлюб: *«А дзе тая крынічанька, // Што голуб купаўся, // А дзе ж тая дзяўчынанька, // Што я заляцаўся? // Ужо тая крынічанька // Травою зарасла, // А ўжо тая дзяўчынанька // За іншага пашла»*. Аднаўленне кахання магчымае пры ўмове аднаўлення крыніцы: *«Ой, я тую крынічаньку // Тыччым пepaтычу, // Да я сваю міленькую // К сабе паклічу. // (Да я сваю міленькую) // Чаўном перапраўлю, // А я сваю міленькую // К сабе перабаўлю»* [9, с. 92]. Акрамя таго, што вобраз крыніцы ў

цытаванай песні надзелены выразнай жаночай і любоўна-эратычнай семантыкай, ён сімвалічна асацыюецца з ідэяй пераходу.

Вобраз крыніцы, асацыяваны з цякучымі слязамі, згадваецца ў апісаннях трагічных сітуацый чалавечага жыцця, раскрываючы самоту лірычнага героя. Так, вобраз крыніцы часта фігуруе ў зачынах песень з вобразна-псіхалагічным паралелізмам і дапамагае распачаць аповед пра перапетыі жаночага лёсу. У структуры вобразна-псіхалагічнага паралелізму крыніца нярэдка – абагульнены знак суму, гора. Пры гэтым вадаём з падкрэслена халоднай вадой можа асацыявацца з дзяўчынай, якая не прытрымліваецца маральных нормаў, парушае ўсталяваныя ў грамадскай свядомасці правілы этыкету сямейнай дабрачыннасці, неабачліва гуляе з хлопцамі: «*Ой, у полі крынічэнька, // Там халодная вада. // Была ў бацькі дочка – // Не дажыла да дабра… // – Вячэрайце, бацька, маці, // Вячэрайце самі, // А я пайду на вуліцу // Гуляць з казакамі*» [5, с. 132]. У песенным вершы, прасякнутым глыбокім лірызмам і журбою, праз вобраз «кіпушчай, гарушчай» крыніцы выяўляецца напружаны эмацыянальны стан гераіні: «*Вот у полі крынічанька, // У крынічаньцы вадзічанька // Кіпушчая, гарушчая. // Баліць маё добра сэрца // Да на свайго нялюбага, // Што ён дома не начуе…*» [10, с. 250]. У іншых песнях каля крыніцы дзяўчына просіць хлопца не разбіваць іх каханне здрадай, папракае любага за няздзейсненае шчасце. Тужлівы настрой песень пра нешчаслівае каханне дзяўчыны да казака ствараецца пры дапамозе сімвалічнай карціны адзінокай асіны над крыніцай. Ідэя адчужанасці блізкіх людзей паэтычна рэалізуецца праз выяўленне крыніцы, якая цячэ за межамі асвоенай прасторы, у полі. Паводле лірычнай песні, муж, які пакідае жонку, на яе запытанне пра магчымасць уладкавання жыцця не ў сваёй хаце, а ў чужой прасторы – полі – адказвае: «*Ёсць у полі крынічка – // То мая вадзічка… // Ёсць у мяне рукавок – // А то мой ручнічок*» [11, с. 263].

Паводле балады, на месцы, дзе, поўныя сардэчнай тугі, развіталіся дачка і маці, пачынаюць цячы крыніцы і вырастае яблыня. У сувязі са сказаным характэрны зачыны вясельных песень, дзе эмацыянальная плынь твораў будуецца шляхам мастацкіх параўнанняў з'яў рэальнага жыцця персанажа з прыроднымі з'явамі: «*Цякла рэчанька, цякла рэчанька, // З крыніцы да язёра, // Заплакала млода дзяўчынанька // Зрана да вячора…*» [3, кн. 5, с. 39]. Эмоцыі лірычнай гераіні гіпербалізуюцца: выцяканне слёз асацыюецца з выцяканнем ракі з крыніцы. Акрамя таго, у цытаваным тэксце актуалізуюцца такія сэнсы вобраза крыніцы, як жаноцкасць і пачатак (адсюль асацыяцыя крыніцы з ранкам). У песнях, дзе перадаецца тужлівы настрой, душэўны боль лірычных герояў, вобразы крыніцы і слёз могуць узаемазамяняцца. Так, дачка-нявеста, сэрца якой поўніцца журбой з нагоды расставання, просіць у маці: «*Палівай, палівай руту-мяту часценька, часценька, // Усё раннімі, вячэрнімі зарамі, зарамі, // Усё сваімі гаручымі слязамі, слязамі. // Слёз не станець – крынічнаю вадою, вадою…*» [3, кн. 5, с. 65].

У значнай колькасці песень-скаргаў, песень-плачаў самотныя лірычныя героі звяртаюць да крыніцы сваю сардэчную скруху. У восеньскай песні пра драматычны лёс гераіні прыніжаная, зняважаная жанчына папракае пастылага мужа, што ён здзекаваўся з яе і пускаў рэчкі з яе дробных слёз. На бездапаможны, адчайны крык душы жонкі-ахвяры муж бяздушна адказвае: «*Пускаў я рэчкі // З крыніц, балотаў*» [12, с. 81]. Такая мастацкая паралель уражвае глыбінёй думкі і пачуцця. У журботных салдацкіх песнях каля крыніцы маладыя хлопцы выпраўляюцца ў паход: «*Там у полі вярба, пад вярбою вада, // Там дзяўчына прыкрасная, ой, там воданьку брала. // Дзеўка ваду бярэ, казак коні вядзе, // Пытаецца дзяўчынанькі: // «Куды дарожанька вядзе?» // – І сюды яна вядзе, і туды яна вядзе, // Аж да тае крынічанькі, там, дзе войска стаяла. // А там старшы стаяў, дробны лісцік пісаў, // Маладзенькіх навабранчыкаў па шарэнгах расстаўляў. // – Ой вы, хлопцы, навабранцы мае, // Заспявайце такую песеньку, каб*

*спадабалася мне. // Хлопцы радам сталі, громкім голасам спелі, // Дробненькімі слёзанькамі ўсю дарожку скрапілі»* [8, с. 203–204].

Звяртае на сябе ўвагу тое, што вобраз крыніцы прадстаўлены ў матывах пра смерць героя. Так, у баладзе на гістарычную тэматыку «Жыла ўдава ў канцы сяла» пра сапраўдную трагедыю чалавека, незваротна страціўшага сваю радзіму, волю, маладая замужніца, якую сілай «туркі ўзялі», хоча скончыць жыццё самагубствам і звяртаецца да мужа-турка: *«Дай, міленькі, вядзёрушка, // Пайду ў крыніцу па вадзіцу»*. Але *«туркава матка яшчэ не спала, // Яна гэта пачула: // – Не давай, сынку, вядзёрушка, // Чужаземка знудзілася, // Яна пойдзе, утопіцца!»* [13, с. 289]. Паводле сямейна-бытавой песні, маладая замужніца, якую напаткаў цяжкі лёс у свёкравай хаце, просіць у маці ўтапіць яе ў бяздоннай крыніцы: *«– Не ўпавай жа, мая мамка, // Што я ў цябе адна, // Ідзі мяне, ўтапі мяне, // Дзе крыніца без дна»* [10, с. 35]. У веснавой карагоднай песні спяваецца, што мілы чакае ад дзяўчыны крынічнай вады, але, паколькі крыніца знаходзіцца далёка, дзяўчына прыносіць ваду аж праз тры гадзіны – хлопец памірае [2, с. 252].

У беларускіх, а таксама ўкраінскіх народных баладах пра зведзеную прыезджымі хлопцамі (уланамі, казакамі, гусарамі) дзяўчыну пачатковым месцам дзеі часта выступае крыніца, дзе хлопцы намаўляюць дзяўчыну паехаць з імі вандраваць: *«У роўным полі крынічанька, // Там сцюдзёна вадзічанька. // Там гусары коні поюць, // З дзяўчыначкай размаўляюць: // – Ой, дзяўчына-дурачына, // Калі хочаш, едзь з намі…»* [9, с. 94]. Прадстаўнікі чужога роду, прыезджыя хлопцы рэальна маглі пазнаёміцца з дзяўчынаю, якая звычайна знаходзілася пад наглядам старэйшых членаў сям’і, у абмежаванай колькасці месцаў. У прыватнасці, неспадзяваная сустрэча дзяўчыны з незнаёмцамі магла адбыцца каля крыніцы (ці ракі), куды яна хадзіла па ваду адна. Паводле баладаў, якія, магчыма, захавалі рэшткі старажытных звычаяў калектыўнага шлюбу, дзяўчына, паверыўшы спакуслівым абяцанням прыгожага жыцця, уцякае з чужынцамі, вандруе з імі і, пазбаўленая цноты, нярэдка застаецца прывязанай да палаючага дрэва. (Згадаем тут сімволіку гарэння як кахання і ачышчэння). У развязцы выяўляецца роспач дзяўчыны, што «свой венчык утраціла пад яварам зеляненькім з гусарыкам маладзенькім», гучыць яе маналог з элементамі пакаяння і зваротам да бацькоў берагчы сваіх дачок ад такой горкай долі.

У дзіцячых песеньках каля крыніцы гуляюць і ў крыніцу падаюць розныя жывёлы, да прыкладу: *«Пойшла кыця по водыцю // Тай упала у крыныцю, // Пушов котык рятуваты, // Свою кыцю вытягаты. // Вытяг кыцю за хвостэць, // Побыв кыцю об плотэць: // – Ото тобі, шо нэ знаеш, // Трэбо було нэ ходыты, // Своіх діток нэ водыты»* (ФЭАБ; зап. ад Алесік Фёклы Максімаўны 1933 г.н. з в. Ланская Маларыцкага р-на).

**Заключэнне**

Як вынікае са сказанага, крыніца ў беларускім песенным фальклоры – сімвалічна значны элемент прасторы, які мае свае функцыі і звязаны з пэўнай групай персанажаў і дзеянняў. У пераважнай бальшыні песень крыніца – локус такіх персанажаў, як жанчына, дзяўчына, хлопец і яго конь, радзей – іншыя жывёлы. У калядках крыніца надзяляецца статусам святога месца, у якім знаходзяцца Божая Маці і Ісус Хрыстос. Крыніца нярэдка выступае мэтай руху галоўнага персанажа песні, каля яе разгортваюцца асноўныя падзеі твора.

Пад жывым уражаннем ад розных характарыстык крыніцы, галоўнымі сярод якіх з’яўляюцца катэгорыі празрыстасці (чысціні), руху і холаду (сцюдзёнасці), працэс этнаэстэтызацыі інтэнсіўна разгортваецца і прадукуе маляўнічую песенную вобразнасць. Прыведзеныя факты пацвярджаюць актуальнасць аб’ектыўных, рэальных прыкмет крынічнай вады для стварэння сімвалічнага вобраза крыніцы. У абрадавых і пазаабрадавых

песнях гэты вобраз сімвалічна звязаны з матывамі маладосці, прыгажосці, кахання, пачатку, сватання, вяселля, забеспячэння чаканых даброт, выступае ўніверсальным знакам жыцця. У песнях на шлюбную тэматыку крыніца надзяляецца жаночай семантыкай і выступае эротыка-сексуальным сімвалам. Сімвалічныя карціны купання ў крыніцы як капання маюць выразны любоўна-эратычны падтэкст. З крыніцай цесна звязаны матыў піцця. Згода дзяўчыны напаіць з крыніцы хлопца ці яго каня сімвалізуе прыняцце кахання, уступленне ў інтымныя стасункі. Пераважная пазітыўная ацэнка крыніцы, верагодна, матывавана яе асобай пазіцыяй у міфапаэтычнай карціне свету – як ідэальнай вады. Калі крыніца атрыбутуецца як бяздонная, ацэнка «добра/дрэнна» ў разглядаемай апазіцыі поўнасцю інверсіруецца, што звязана з адмоўнай аксіялагізацыяй бездані. Вынясенне крыніцы за межы сваёй прасторы падкрэслівае сімвалічную семантыку, якой валодае вада ў народнай культуры ў цэлым. Яна выступае мяжой, якая аддзяляе замагільны свет ад свету людзей. Таму прасторавая схема, у якую змешчана крыніца, можа сімвалізаваць смерць персанажа. Фукцыянаванне крыніцы як абагульненага знака суму абумоўлена яе асацыяцыяй з цякучымі слязамі і шырэй – міфалагічнай карэляцыяй вады з матывамі небяспекі і смерці.

Што да эпітэта вады «крынічная» ў лірычных песнях, то ён, верагодна, па сваёй сутнасці выконвае функцыю ўпрыгожання, указвае пераважна на анталагічную ўласцівасць вады. Тым не менш гэты эпітэт, надзелены ацэначнай функцыяй, здатны выяўляць істотныя асаблівасці беларускага песеннага ўніверсуму, фарміраваць яго вобразныя і сюжэтныя абрысы. Можна асцярожна выказаць меркаванне, што вобраз крыніцы сваёй мастацкай семантыкай нясе выразную этнаэстэтычную дамінанту нацыянальнай вусна-паэтычнай традыцыі беларусаў. Глыбокае даследаванне функцыянавання гэтага вобраза ва ўсіх відах і жанрах беларускага фальклору з'яўляецца важным звяном вывучэння катэгорый этнанацыянальнай эстэтыкі.

## СКАРАЧЭННІ

ФЭАБ – Фальклорна-этнаграфічны архіў кафедры беларускага літаратуразнаўства УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Зайкоўскі, Э.М. Крыніцы / Э.М. Зайкоўскі // Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / Г.П. Пашкоў (гал. рэд.). – Мінск, 2005–2006. – Т. 1 : А–К. – 2005. – С. 730–731.
2. Веснавыя песні / склад. Г.А. Барташэвіч, Л.М. Салавей, В.І. Ялатаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 607 с.
3. Вяселле. Песні : у 6 кн. / склад. Л.А. Малаш, З.Я. Мажэйка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980–1988. – Кн. 1. – 1980. – 680 с. ; Кн. 5. – 1986. – 707 с.
4. Купальскія і пятроўскія песні / уклад. А.С. Ліса, С.Т. Асташэвіч, Г.В. Таўлай. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 631 с.
5. Песні пра каханне / склад. І.К. Цішчанкі, С.Г. Нісневіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 616 с.
6. Мажэйка, З.Я. Песні Беларускага Падняпроўя / З.Я. Мажэйка, Т.Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 392 с.
7. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў . У 6 т. Т. 4: Брэсцкае Палессе : У 2 кн. Кн. 1 / А.М. Боганева [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2008. – 559 с.
8. Песні Беласточчыны / уклад. М. Гайдук. – Мінск : Бел. навука, 1997. – 367 с.
9. Зайкоўскі, Э.М. Жыватворныя крыніцы Беларусі / Э.М. Зайкоўскі, Л.І. Дучыц. – Мінск : Ураджай, 2001. – 111 с.

10. Сямейна-бытавыя песні / склад. І.К. Цішчанка, Г.В. Таўлай. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 752 с.

11. Лірычныя песні / уклад. і рэд. Н.С. Гілевіча. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1976. – 464 с.

12. Восеньскія і талочныя песні / склад. А.С. Ліс, С.Т. Асташэвіч, В.І. Ялатаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 678 с.

13. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 477 с.

***Shved I.A.*** **The Symbolism of the Image of Source in Byelorussian Song Folklore**

The author of the article analyzes the semantic, symbolic and functions of the image of source as a part of landscape-nature code of Byelorussian song folklore. Actualization of such characteristics of source as cold, transparent, clear and fast-run water motives the symbolic correlation of this water object with ideas of development, fertility, creative potential, activity, health, quick growth, purity, change of state, success. Function of source, as general sign of grief, is caused by its association with tear and widely – by mythological correlation of water with motives of dangerous and dearth.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 3.02.2010